# 28 красавіка Міжнародная арганізацыя працы адзначае Сусветны дзень аховы працы

28 красавіка Міжнародная арганізацыя працы адзначае Сусветны дзень аховы працы.

У 2022 годзе тэма Сусветнага дня аховы працы - "Агульнымі намаганнямі сфарміраваць пазітыўную культуру аховы працы".

Наяўнасць надзейнай сістэмы аховы працы, якая функцыянуе пры актыўным удзеле ўрадаў, работадаўцаў, работнікаў, органаў аховы здароўя і ўсіх зацікаўленых бакоў на нацыянальным узроўні і на ўзроўні прадпрыемстваў, адыгрывае найважнейшую ролю ў захаванні нармальных умоў працы і забеспячэнні бяспекі і здароўя работнікаў.

На працоўным месцы высокая культура аховы працы – гэта культура, у якой права на бяспечнае і здаровае працоўнае асяроддзе шануецца і заахвочваецца як кіраўніцтвам, так і работнікамі.

У цэлым сёння ва ўсім свеце пытанне бяспекі на вытворчасці ўспрымаецца як адна з найважнейшых тэм сферы працы. Асноўная тэза – годная праца павінна быць бяспечнай.